Источник: "Беларуская думка" - № 3, 2013-03-25



# Хатынь – наш смутак і боль

Хатынь. 22-га сакавіка 1943 года, роўна 70 гадоў таму, у гэтай невялікай вёсцы пад Лагойскам раптоўна, трагічна і назаўсёды спыніўся бег часу – 149 яе жыхароў, у тым ліку 75 дзяцей, былі жывымі спалены карнікамі, пасля чаго Хатынь папоўніла жалобны спіс соцень беларускіх паселішчаў, знішчаных нацыстамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.
Крыху пазней менавіта гэтай, так і не адноўленай у пасляваенны час вёсцы наканавана было стаць галоўным нацыянальным помнікам жалобы і смутку і ў той жа час помнікам бязмежнай мужнасці беларускага народа, які, нягледзячы на велізарныя страты, змог выстаяць, перамагчы ворага і пабудаваць сваю незалежную дзяржаву. Сёння гэты мемарыял вядомы ўсяму свету. Сюды прыязджаюць людзі, каб спрычасніцца да сумнай памяці аб загінуўшых хатынцах і душой і сэрцам адчуць боль трагедыі, каб усвядоміць жудасную жорсткасць, якую прыносіць з сабой вайна.

У любую пару года і пры любым надвор'і ў Хатыні пануе журбота. Нават у самы ясны і сонечны летні дзень тут на людскіх тварах не запрыкмеціш усмешак: усе, хто сюды прыязджае, добра ведаюць, што Хатынскі мемарыял у Беларусі – месца асаблівае, азмрочанае вялікай людской бядой. І напамін пра гэтую трагедыю сустракаецца тут літаральна на кожным кроку: у велічным помніку «Няскоранага чалавека», у абрысах сімвалічных рэшткаў спаленых вясковых хат, у адлітых з бетону лічбах панесеных Хатынню людскіх страт, у назвах знішчаных фашыстамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, ды так і не адноўленых па сённяшні дзень 186 беларускіх вёсак… Не дае пра гэта забыцца і прыцішана-жалобнае гучанне сусветна вядомых тамтэйшых званоў, што разносіцца па наваколлі два разы на хвіліну.

Супрацоўнікі Дзяржаўнага мемарыяльнага комплексу «Хатынь» расказваюць, што за гады існавання велічнага архітэктурна-мастацкага ансамбля, які быў адкрыты да 25-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, яго наведала каля 40 мільёнаў чалавек больш як са 100 краін свету. Напэўна, у кожнага з іх было сваё ўспрыманне нашага нацыянальнага болю, аднолькавым жа было ўсведамленне бесчалавечнага сэнсу любога ваеннага супрацьстаяння.

У савецкі час прынята было гаварыць, што вёску Хатынь спалілі разам з яе жыхарамі фашысты. І ў гэтым ніхто не сумняваўся. Аднак у пасляперабудовачны час асобныя даследчыкі гісторыі ваеннага ліхалецця на Беларусі паспрабавалі аспрэчыць гэты факт. Імі прапаноўваліся розныя і падчас самыя неверагодныя версіі хатынскай трагедыі. Некаторыя нават дагаварыліся да таго, што да падзей у Хатыні мелі дачыненне нейкія ўяўныя пераапранутыя ў нямецкую форму савецкія вайсковыя фарміраванні, якія былі спецыяльна закінуты ў тыл, каб чыніць зверствы над мірным насельніцтвам і тым самым распальваць у яго нянавісць да акупантаў.

Зразумела, такія сцверджанні не мелі і не маюць нічога агульнага з рэальнасцю. Тым больш, што іх паспяхова абвяргаюць публікацыі, заснаваныя на архіўных дакументах. Большасць з іх і склалі зборнік «Хатынь. Трагедия и память», выдадзены тры гады таму Нацыянальным архівам Рэспублікі Беларусь сумесна з Дэпартаментам па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі, Дзяржаўным мемарыяльным комплексам «Хатынь» і Цэнтральным архівам Камітэта дзяржаўнай бяспекі нашай краіны. Яго матэрыялы праліваюць святло на некаторыя малавядомыя раней аспекты хатынскай трагедыі. У тым ліку і на ролю ў ёй 118-га паліцэйскага ахоўнага батальёна. Гэтае вайсковае падраздзяленне было сфарміравана нямецкімі акупантамі вясной 1942 года на Украіне, пад Кіевам,



Сяргей Галоўка. Хатынь – наш смутак і боль

з ліку завербаваных савецкіх ваеннапалонных, перабежчыкаў і ўсялякага іншага крымінальнага зброду. І ўсё ж называць яго чыста ўкраінскім нельга: у ім служылі таксама прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей. Нават, калі батальён перадыслацыраваўся ў Мінск, а затым і ў блізкія да Хатыні Плешчаніцы, на службу ў ім запісаліся некаторыя мясцовыя жыхары. Усе гэтыя пярэваратні, незалежна ад сваёй нацыянальнай прыналежнасці, разам з нямецкімі кадравымі карнікамі ўчынілі ў Хатыні злачынства, даравання за якое ніколі і нікому не будзе. Прынамсі, ад нас, беларусаў.

## Помста

Ход хатынскіх падзей быў хуткі і непрадказальны. 22 сакавіка 1943 года для аднаўлення пашкоджанай партызанамі сувязі паміж Плешчаніцамі і Лагойскам былі накіраваны два ўзводы 1-й роты таго самага 118-га паліцэйскага ахоўнага батальёна. Пад'ехаўшы да месца абрыву лініі сувязі, паліцаі адразу ж трапілі ў засаду, арганізаваную партызанскім атрадам «Мсцівец» брыгады «Дзядзькі Васі» (пазней – брыгада «Народныя мсціўцы» імя В. Варанянскага). У хуткацечнай перастрэлцы, пасля якой партызаны адразу ж адступілі, былі забіты нямецкі шэф-камандзір роты гаўптман Ганс Вёльке і два паліцэйскія, яшчэ некалькі фашысцкіх прыслугачоў атрымалі цяжкія раненні.

На першы погляд, для акупантаў гэта было чарговае і не асабліва надзвычайнае здарэнне: у лагойска-плешчаніцкай лясной зоне партызаны даволі часта наладжвалі засады, грамілі варожыя гарнізоны і асобныя вайсковыя падраздзяленні. Здаралася, што фашысцкія захопнікі неслі і значна большыя страты. Аднак для іх гэты выпадак аказаўся асаблівым. Справа ў тым, што забіты нямецкі афіцэр Ганс Вёльке быў у Германіі вядомай асобай. І нават любімчыкам самога Гітлера. У даваенны час ён быў цесна звязаны са спортам, меў пэўныя дасягненні. Але сусветную вядомасць яму прынесла Алімпіяда 1936 года, якая праходзіла ў Германіі.

Месцам правядзення XI летніх Алімпійскіх гульняў Берлін быў абраны яшчэ да прыходу Гітлера да ўлады. Аднак фюрэр быў цвёрда перакананы, што Алімпіяда здольная падняць прэстыж яго фашысцкага рэжыму ў вачах сусветнай грамадскасці. Цырымонія адкрыцця берлінскай Алімпіяды атрымалася велічнай і грандыёзнай, на ёй прысутнічала больш за 90 тысяч чалавек. І ў першы ж алімпійскі дзень Ганс Вёльке не толькі ўстанавіў сусветны рэкорд у штурханні ядра – 16,2 м, але і стаў першым у гісторыі немцам, які атрымаў алімпійскую ўзнагароду ў лёгкай атлетыцы. Спартсменгерой адразу ж быў запрошаны ва ўрадавую ложу для асабістага віншавання фюрэрам і, вядома, для сумесных з ім фатаграфій, якія затым разышліся па ўсім свеце. Нямецкія газеты на ўсе лады сталі праслаўляць Вёльке, а гебельсаўская прапаганда – выкарыстоўваць яго імя ў агітацыйных матэрыялах. У падарунак ад Гітлера алімпійскі чэмпіён тут жа атрымаў афіцэрскі чын. Але пасля нападу Германіі на СССР на фронт ён не трапіў: быў накіраваны на больш ціхую (як спачатку здавалася) пасаду – камандзірам адной з карных рот усё таго ж 118-га паліцэйскага ахоўнага батальёна.



▲ Скульптура «Няскораны чалавек»

Смерць ад партызанскай кулі любімца фюрэра (дарэчы, Гітлер, атрымаўшы звесткі пра забойства Вёльке, пасмяротна павысіў яго ў званні і прызначыў пажыццёвую пенсію членам сям'і) прымусіла паліцаяў моцна патурбавацца пра свой далейшы лёс. Тое, што яны не ўберaглі свайго камандзіра-немца, магло ім дорага каштаваць. Менавіта таму яны даволі хутка адрамантавалі пашкоджаную лінію сувязі і выклікалі з Лагойска для праследу партызан падмогу. А пакуль той не было, фашысцкія прыслу-



гачы праявілі надзвычайную ініцыятыву і арыштавалі больш як паўсотні жыхароў суседняй вёскі Казыры, што па загаду немцаў займаліся высечкай лесу ўздоўж лагойскай шашы. Маўляў, яны былі ў курсе наладжанай партызанамі дыверсіі і арганізаванай імі засады, але не папярэдзілі абаронцаў «новага парадку» аб гэтым. Без аніякіх разборак паліцаі вырашылі адканваіраваць арыштантаў у Плешчаніцы.

Аднак пасля таго як паліцэйскай роце на выручку з Лагойска падаспеў спецбатальён штурмбанфюрэра Аскара Дзірлевангера, вясковыя лесарубы, вырашыўшы, што эсэсаўцы прыехалі, каб іх расстраляць, сталі разбягацца. Карнікі тут жа распачалі стральбу. Было забіта 26 чалавек, многія атрымалі цяжкія раненні, але дваім вяскоўцам усё ж удалося ўцячы і схавацца ў бліжэйшым лесе.

Завяршыўшы расправу, азвярэлыя паліцэйскія і салдаты спецбатальёна Дзірлевангера заняліся пошукамі народных мсціўцаў, якія арганізавалі засаду ля лагойскай шашы. Праз некаторы час ім удалося адшукаць пакінутыя партызанамі на сакавіцкім снезе сляды: яны і прывялі іх у ахаваную лесам Хатынь. Карнікі ўварваліся ў вёску і завязалі бой з партызанамі, што знайшлі там часовы сховішча. Пад націскам шмат больш сіл праціўніка народныя мсціўцы мусілі адступіць. Карнікі не сталі іх пераследаваць, а ўчынілі расправу над хатынцамі.

## Гарэла ўсё і ўсюды…

Літаральна ўсіх вяскоўцаў – дарослых, старых, жанчын, дзяцей – карнікі сагналі ў калгаснае гумно. Ніхто з дарослых не змог застацца імі незаўважаным. Толькі траім дзецям – Сашу Жалабковічу, Валодзю Яскевічу і яго сястры Соні ўдалося схавацца ад гітлераўцаў. Калі ўсе жыхары вёскі былі ў гумне, фашысты заперлі дзверы, аблажылі будыніну саломай, аблілі бензінам і падпалілі. Драўлянае гумно імгненна загарэлася. У дыме задыхаліся і плакалі дзеці. Дарослыя спрабавалі ратаваць іх. Пад націскам дзясяткаў чалавечых цел не вытрымалі і ўпалі дзверы. У ахопленым агнём адзенні, апанаваныя жахам, людзі кінуліся бегчы, але тых, хто вырваўся з полымя, фашысты расстрэльвалі з аўтаматаў і кулямётаў. Загінулі 149 чалавек, з іх 75 дзяцей да 16-гадовага ўзросту. Вёска была разрабавана і спалена.

З дзяцей, якія знаходзіліся ў хляве, цудам удалося выжыць дваім – дванаццацігадоваму Антону Бараноўскаму і сямігадоваму Віктару Жалабковічу. Антон, паранены ў нагу разрыўной куляй, працяглы час ляжаў нерухома, і гітлераўцы палічылі яго мёртвым. А Віктара цаной свайго жыцця выратавала маці – жанчына, якая вырвалася з палаючага гумна, была смяротна паранена і, падаючы долу, сваім целам прыкрыла сына.

Праўда, разам з імі выратаваліся з полымя яшчэ і дзве дзяўчыны – Марыя Федаровіч і Юлія Клімовіч, але лёс іх аказаўся двойчы трагічным. Абгарэлых, ледзь жывых, іх падабралі жыхары суседняга хутара Хварасцені. Але і гэта паселішча праз некаторы час было спалена фашыстамі, і абедзве дзяўчыны загінулі.

Адзіны дарослы сведка хатынскай трагедыі – 56-гадовы вясковы каваль Іосіф Камінскі, абгарэлы і паранены, апрытомнеў позна ноччу, калі фашыстаў ужо не было ў вёсцы. Але яму літаральна адразу ж давялося перажыць яшчэ адзін цяжкі ўдар: сярод трупаў аднавяскоўцаў ён знайшоў свайго сына, хлопчык быў паранены ў жывот, атрымаў моцныя апёкі і на руках у бацькі памёр. Іосіф Камінскі з памерлым сынам на руках паслужыў прататыпам для знакамітай скульптуры «Няскораны чалавек» на галоўнай алеі Хатынскага мемарыяльнага комплексу.

## Відавочцы сведчаць

Нягледзячы на тое, што ўсё ўчыненае фашыстамі, якой бы яны нацыянальнасці ні былі, над жыхарамі Хатыні проста не ўспрымаецца розумам, перыпетыі гэтай трагедыі назаўсёды засталіся ў памяці яе нешматлікіх відавочцаў. На іх сведчанні, што захоўваюцца ў архіўных матэрыялах, спашлёмся тут перш за ўсё дзеля таго, каб найбольш поўна адлюстраваць ход падзей.

З пратакола допыту **Іосіфа Камінскага,** 31 студзеня 1961 года: «… *21 сакавіка 1943 года, у нядзелю, у вёску Хатынь прыехала шмат партызан, назвы атрада і брыгады я не памятаю. Пасля начлегу, раніцай яшчэ было цёмна, большая частка іх выехала з нашай вёскі. У сярэдзіне дня, г.зн. у панядзелак 22 сакавіка 1943 года, я, знаходзячыся дома ў вёсцы Хатынь, пачуў страляніну каля вёскі Казыры, якая знаходзіцца за 4–5 км ад Хатыні…*

*Не памятаю дакладна, здаецца, у 15 гадзін дня партызаны вярнуліся... Праз гадзіну-паўтары нашу вёску сталі акружаць немцы, пасля чаго паміж імі і партызанамі завязаўся бой... Партызаны пасля гадзіннага бою, прыкладна, адступілі, а салдаты нямецкіх войскаў сталі збіраць падводы і грузіць на іх маёмасць... Жыхароў пачалі зганяць у гумно, якое месцілася за 35–50 метраў ад маёй хаты... Да мяне ў хату спачатку зайшлі 6 карнікаў, якія размаўлялі на ўкраінскай і рускай мовах... Усе яны былі ўзброены вінтоўкамі. Дома тады былі я, мая жонка Адэля і чацвёра дзяцей ад 12 да 18 гадоў...*

*...Калі я прыйшоў у гумно, то там ужо былі чалавек 10 грамадзян, у тым ліку мая сям'я. Я яшчэ спытаў, чаму яны распранутыя, на што мая жонка Адэля і дачка Ядвіга адказалі, што іх карнікі распранулі. Людзей працягвалі зганяць у гэтае гумно, і яно праз непрацяглы час было запоўнена зусім, што нават нельга падняць рук. Памер гумна 12х6, у яго загналі чалавек сто сем маіх аднавяскоўцаў... Я зразумеў, што нас будуць расстрэльваць, і сказаў жыхарам, якія знаходзіліся побач са мной: «Маліцеся Богу, таму што тут памруць усе». На гэта карнік, які стаяў ля дзвярэй, адказаў: «О цэ, іконы таптали, іконы палілі, мы зараз вас спалім». Гэтыя словы карніка мне асабліва запомніліся, бо ў пуню былі сагнаны мірныя жыхары, сярод іх шмат малых дзяцей і нават немаўлят...*

*Асуджаныя на смерць людзі, у тым ліку я і члены маёй сям'і, моцна плакалі, крычалі. Адчыніўшы дзверы гумна, карнікі сталі расстрэльваць з кулямётаў, аўтаматаў і іншай зброі грамадзян, але страляніны амаль не было чутна з-за моцнага лямanту людзей. Я са сваім 15-гадовым сынам Адамам апынуўся каля сцяны. Забітыя грамадзяне падалі на мяне, яшчэ жывыя мітусіліся ў агульным натоўпе, нібыта хвалі, лілася кроў з раненых і забітых. Абваліўся дах, які гарэў, страшнае, дзікае скавытанне людзей яшчэ больш узмацнілася... Мне ўдалося з-пад трупаў і людзей, якія гарэлі, выбрацца і дапаўзці да дзвярэй. Тут жа згаданы мной вышэй карнік... з аўтамата выстраліў па мне, у выніку я быў паранены ў левае плячо...*

*Мой сын Адам, абгарэлы, невядома як выскачыў з гумна, але за метраў 10 ад гумна, пасля выстралаў, упаў. Я, ранены, каб не страляў болей па мне карнік, ляжаў без*

## МЕРКАВАННЕ



**Сяргей АЗАРОНАК, дырэктар Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны:**

– Колькі б ні прайшло гадоў з дня хатынскай трагедыі, для беларускага народа памяць пра яе заўсёды будзе свяшчэннай. Хатынь – гэта не толькі сімвал людской бяды і адна з найбольш жахлівых старонак Вялікай Айчыннай вайны. Гэта наш нацыянальны боль, час яго не залечыць ніколі.

У нашым музеі існуе экспазіцыя, прысвечаная спаленым у гады вайны беларускім вёскам. Яна таксама ўражвае, прымушае задумацца аб крохкасці жыцця і бесчалавечнасці тых, хто на яго пасягае. У Хатыні я неаднойчы лавіў сябе на думцы, што гэтае адчуванне там эмацыянальна не проста ўзмацняецца, а напаўняе душу гонарам за бязмежную мужнасць беларускага народа, які выстаяў і перамог ненавіснага ворага. Дарэчы, Хатынскі мемарыяльны комплекс на працягу амаль сарака гадоў з'яўляўся філіялам Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. Больш таго, менавіта матэрыялы з Хатыні – абгарэлыя часткі сельгасінвентару і іншыя рэчы – складаюць аснову нашай экспазіцыі, прысвечанай спаленым вёскам.

На жаль, шматлікія архіўныя матэрыялы пра хатынскую трагедыю не бяруцца пад увагу асобнымі даследчыкамі, якія дзеля нейкіх сваіх амбіцый імкнуцца абылгаць святую памяць. Так, у знішчэнні Хатыні разам з салдатамі спецбатальёна штурмбанфюрэра Аскара Дзірлевангера браў удзел 118-ы паліцэйскі ахоўны батальён, які быў сфарміраваны ў 1942 годзе на Украіне. Служылі ў ім украінцы, рускія, беларусы, прадстаўнікі іншых народаў былога Савецкага Саюза. Зразумела, што ўсе яны былі здраднікі, якія перайшлі на службу ворагу. Але адшчапенцы і вылюдкі ёсць усюды. Ды і фашызм як з'ява не мае нацыянальнасці. Вось пра гэта і трэба гаварыць, а не пра тое, што трагедыя Хатыні – справа рук украінцаў.

Ці яшчэ. Чаму месцам стварэння мемарыяла была выбрана менавіта Хатынь? Той-сёй на поўным сур'ёзе імкнецца даказаць, што гэта было зроблена наўмысна, дзеля нівеліравання паняцця Катынь як месца масавага знішчэння польскіх афіцэраў і салдат у перадваенныя гады. Так, сугучча ў гэтых тапонімах бясспрэчнае. Але толькі і ўсяго. Рашэнне ж аб стварэнні Хатынскага мемарыяльнага комплексу было прынята ў 1966 годзе ўладамі тагачаснай Беларусі, а не ў савецкай Маскве, якая, трэба думаць, была зацікаўлена ў замоўчванні катынскага пытання. Сёння ў мемуарнай літаратуры можна знайсці шмат згадак пра тое, як у адрас ініцыятара стварэння мемарыяла на месцы спаленай Хатыні П.М. Машэрава неаднойчы выказвалася незадавальненне з боку вышэйшага партыйнага кіраўніцтва СССР. Таму я перакананы: аб нейкім ідэалагічным заказе з Масквы і наўмысным супастаўленні хатынскай трагедыі і падзей 1940 года ў Катыні размовы быць не можа.



*руху, прыкінуўшыся памерлым, але частка даху, што гарэў, упала мне на ногі, і ў мяне загарэлася вопратка. Я пасля гэтага пачаў выпаўзаць з гумна, узняў трошкі галаву, убачыў, што карнікаў у дзвярах ужо няма… У мяне былі абгарэлыя задняя частка цела і рукі. Ляжаў я зусім разуты, бо зняў гарэўшыя валёнкі, калі выпаўз з гумна. Ляжаў на снезе ў лужыне крыві…*

*Хутка я пачуў сігнал да ад'езду карнікаў, а калі яны трошкі ад'ехалі, мой сын Адам, які ляжаў непадалёк ад мяне, прыкладна, метры за тры, паклікаў мяне да сябе… Я падпоўз, прыпадняў яго, але ўбачыў, што ён перарэзаны кулямі папалам. Мой сын Адам яшчэ паспеў спытаць: «А ці жывая мама?» – і тут жа памёр. Я сам падняцца і рухацца не мог, але хутка падышоў да мяне мой швагер Яскевіч Іосіф Антонавіч, які пражываў на хутары за паўтара прыкладна кіламетра ад Хатыні, і адвёў да сябе дамоў, больш дакладна, нёс на сабе. Хатынь ужо цалкам дагарала.*

*Гэта было ўвечары 22 сакавіка 1943 года, калі змяркалася…»*

З пратакола допыту **Віктара Жалабковіча**, 4 чэрвеня 1986 года: «*…У нашым раёне дзейнічалі шматлікія партызанскія атрады, у сувязі з чым партызаны часта наведвалі вёску Хатынь, каб папоўніць запасы харчавання і адпачыць. 22 сакавіка 1943 года – гэты дзень я запомніў на ўсё жыццё – у вёсцы таксама былі партызаны. Прыкладна ў сярэдзіне дня… я пачуў страляніну, якая даносілася з супрацьлеглага боку вёскі… Пасля таго як партызаны пакінулі наш падворак, уся наша сям'я схавалася ў пограбе. Праз непрацяглы час дзверы погреба адчыніліся, і адзін з карнікаў загадаў нам падняцца наверх. Не дазволіўшы зайсці ў хату, нас усіх далучылі да іншых жыхароў вёскі, якія жылі па суседству з намі, і пагналі ў цэнтр вёскі… Усю нашу сям'ю разам з іншымі аднавяскоўцамі карнікі загналі ў калгаснае гумно… Колькі мы знаходзіліся ў гумне, сказаць не магу, але мне падалося не менш за гадзіну. Некаторыя з жыхароў, якія знаходзіліся ў хляве, каб супакоіць сваіх аднавяскоўцаў, выказвалі здагадкі, што карнікі вырашылі іх папалохаць і праз некаторы час адпусціць па хатах. Хтосьці з іх, узлезшы да крокваў гумна, вырашыў паглядзець праз адтуліны ў саламянай страсе, што ж адбываецца на вуліцы. Аднак карнікі, якія знаходзіліся каля гумна, заўважылі гэта і стрэлілі ў яго, але куля прайшла міма… Знаходзячыся каля маці ля ўваходу ў гумно, я ўбачыў праз шчыліны ў гумне, як карнікі пачалі падкідваць да сцен гумна салому… а затым сталі паліваць з каністраў бензінам сцены гумна і салому, пасля чаго ўсё гэта падпалілі. Калі агонь ахапіў дах і сцены гумна, звар'яцелыя ад страху людзі, разумеючы, што ім наканавана жыўцом згарэць у агні, кінуліся натоўпам да дзвярэй гумна, закрытага звонку драўлянай засаўкай, папросту кажучы, «завалам», і сарвалі дзверы. Выбраўшыся з палаючага гумна, людзі траплялі пад кулі карнікаў і падалі ў некалькіх метрах ад хлява. Я разам з маці… нейкім цудам пераадолелі гэтыя некалькі метраў, якія аддзялялі нас ад застрэленых аднавяскоўцаў, жывымі і цэлымі. Накрыўшы мяне сабой, маці шапнула, каб я не рухаўся. У гэты час я адчуў, як куля апякла мне левае плячо, паведаміў пра гэта маці і тут жа адчуў, як яна моцна здрыганулася, па ўсім яе целе прайшла сутарга і яна заціхла, не адказваючы на мае пытанні «што з табой, мама». Я зразумеў, што яна мёртвая.*

*Ад пажарышча ў мяне пачало тлець адзенне, каб неяк вынатавацца ад агню, я адпоўз незаўважаным карнікамі на некалькі метраў убок і працягваў нерухома ляжаць да таго часу, пакуль не спынілася стральба і я не пачуў аддалены гук трубы. Зразумеўшы, што карнікі сышлі з вёскі, я падняўся на ногі. Тое, што я ўбачыў, узрушыла мой дзіцячы розум. Першае жаданне, якое ў мяне паўстала, – гэта падзяліць долю маіх аднавяскоўцаў, згарэлых і загінуўшых ад куль карнікаў. Калі б была такая магчымасць, я, не раздумваючы, кінуўся б у агонь, у якім загінулі мой бацька, браты і сястра… На папялішчы трыма групамі на адлегласці некалькіх метраў адзін ад аднаго ў розных позах ляжалі абгарэлыя трупы мужчын, жанчын і дзяцей. Некаторыя з іх яшчэ падавалі прыкметы жыцця і прасілі мяне даць ім вады. Я набіраў з бліжэйшых лужын чырвоную ад крыві ваду і ў прыгаршчах падносіў ім. Нават сваім дзіцячым розумам я разумеў, што гэтыя людзі асуджаныя і іх чакае немінучая смерць…»*

## Апраўданні, якім няма апраўдання

З паказанняў падсуднага **Уладзіміра Мялешкі** на пасяджэнні Ваеннага трыбунала Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай

акругі, 13 мая 1975 года: «*...Усяго на Хатынь тады наступала 150–160 паліцэйскіх нашага батальёна (118-ы паліцэйскі ахоўны батальён.* – ***Аўт.****) і 100 чалавек эсэсаўцаў (батальён СС Дзірлевангера.* – ***Аўт.****). ...Як я зразумеў, мы сталі рухацца ў напрамку Хатыні ў сувязі з тым, што ў той бок сышлі партызаны.*

*Я са сваім узводам рухаўся ў гэтым напрамку, які ўказаў камандзір роты Вінніцкі. У гэтым жа кірунку рухаліся і іншыя паліцэйскія. Як толькі мой узвод выйшаў з лесу, паблізу аказалася вёска, з якой пачалі ўцякаць людзі. Хто былі гэтыя людзі – мясцовыя ці партызаны – не ведаю. Камандзір роты Вінніцкі загадаў адкрыць агонь па людзях, якія ўцякалі, і па самой вёсцы... Калі ўвайшлі ў вёску, то паступіла каманда – усіх жыхароў Хатыні сабраць у цэнтр вёскі. Такую каманду я атрымаў ад Вінніцкага і, у сваю чаргу, даў загад свайму ўзводу. Мае падначаленыя сталі хадзіць па дамах і выганяць людзей. Я асабіста знаходзіўся на вуліцы, кантраляваў дзеянні падначаленых. Сам жа ў дамы не заходзіў і людзей адтуль не выганяў. Людзей збіралі на вуліцы ў цэнтры вёскі, дзе знаходзіліся камандаванне батальёна і эсэсаўцы. Затым я атрымаў ад Вінніцкага каманду канваіраваць... жыхароў – старых, жанчын і дзяцей – да гумна, якое стаяла недалёка. Я такі загад даў камандзірам аддзяленняў Лакусце і Катруку, якія пачалі з падначаленымі канваіраваць жыхароў да гумна.*

*Людзей загналі ў гумно, дзверы зачынілі. Стала ясна, што іх будуць знішчаць. Непасрэдна ў гумно я людзей не заганяў і не загадваў гэта рабіць сваім падначаленым. Па загадзе Вінніцкага я выставіў у ачапленне гумна паліцэйскіх свайго ўзвода. У ачапленні знаходзіліся і іншыя карнікі. Там жа, побач з гумном, знаходзіліся Смоўскі, Васюра, Кернер і іншыя. Я нядоўга пабыў каля іх, а затым па ўказанні Вінніцкага пайшоў да сваіх падначаленых у ачапленне.*

*Тут загарэлася гумно з людзьмі. Падпаліў яго перакладчык штаба Луковіч. Людзі ў гумне сталі крычаць, маліць аб літасці, чулася скавытанне, жахлівая была карціна, страшна было слухаць. Выламалі дзверы гумна, выскачыў чалавек у полымі. Тады Кернер загадаў адкрыць па гумну агонь.*

*Мне такі загад даў Вінніцкі, а я перадаў яго сваім падначаленым. Усе карнікі, якія*

## МЕРКАВАННЕ



**Артур ЗЕЛЬСКІ, дырэктар Дзяржаўнага мемарыяльнага комплексу «Хатынь»:**

– Трагедыя Хатыні – не выпадковы эпізод вайны, а адзін з тысяч фактаў, што сведчаць аб мэтанакіраванай палітыцы нацысцкага генацыду ў адносінах да насельніцтва нашай краіны. І пра гэта трэба памятаць. За перыяд Вялікай Айчыннай вайны загінуў амаль кожны трэці (раней лічылася, што кожны чацвёрты, і гэты факт лёг у аснову фрагмента мемарыяла «Вечны агонь») жыхар Беларусі, былі разбураны 209 гарадоў і паселішчаў гарадскога тыпу, 9 200 вёсак. Лёс Хатыні падзялілі 628 вёсак Беларусі, з іх 186 так і не былі адноўлены пасля вайны... Усе гэтыя лічбы і факты ўключаны ў экспазіцыйны праект Хатынскага комплексу як наказ нашчадкам берагчы мір.

У адрозненне ад іншых музейных устаноў Дзяржаўны мемарыяльны комплекс «Хатынь» мае сваю спецыфіку. Рознага кшталту забаўляльнымі мерапрыемствамі і нацыянальным гастранамічным сэрвісам наведвальнікаў сюды не прывабіш. Ды і не варта, бо гэтыя рэчы на месцы жалобы і смутку проста недапушчальныя. Хатынскі мемарыял – гэта аб'ект памяці, прызначаны для ачышчэння душы і выхавання асобы, для абуджэння патрыятычных пачуццяў. Сюды трэба прыходзіць нібыта ў храм. Тут кожнае дрэўца, кожная травінка расказваюць аб той страшнай трагедыі, якая нікога не пакідае раўнадушным.

Не магу згадзіцца з тымі, хто галаслоўна сцвярджае, што цікавасць да Хатыні зніжаецца. Гэта не так. У апошнія гады ў нас назіраецца рост колькасці наведвальнікаў. Так, калі ў 2011 годзе ў Хатынскім мемарыяле пабывала каля 185 тысяч чалавек, то летась – ужо звыш 200 тысяч. Сёння можна прывесці шмат прыкладаў, калі грамадзяне Расіі, Украіны, жыхары прыбалтыйскіх дзяржаў прызнаюцца нашым супрацоўнікам, што менавіта Хатынь – галоўная мэта іх візіту ў Беларусь.

Хатынскі музейны комплекс жыве таксама і паўнацэнным творчым жыццём. Нашы супрацоўнікі робяць усё магчымае, каб жалобныя гукі хатынскіх званоў прайшлі праз сэрцы як мага большай колькасці людзей, і асабліва моладзі, акцэнтуючы пры гэтым увагу на трагізме і гераізме, праяўленым беларускім народам у барацьбе з фашысцкімі акупантамі. Рэгулярна праводзяцца і разнастайныя інфармацыйна-патрыятычныя акцыі, арганізоўваюцца сустрэчы са сведкамі са спаленых вёсак. Да 70-годдзя хатынскай трагедыі мы сумесна з Мінскім аблвыканкамам, Інстытутам гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, міжнародным грамадскім аб'яднаннем «Узаемаразуменне» і германскім фондам «Памяць, адказнасць і будучыня» падрыхтавалі міжнародную навукова-практычную канферэнцыю «Хатынь: 1943–2013. Падзеі. Людзі. Памяць». Значнае мерапрыемства патрыятычнай накіраванасці – жалобны мітынг-рэквіем 22 сакавіка ў Дзяржаўным мемарыяльным комплексе «Хатынь» – даніна нашай памяці і павагі ўсім жыхарам Беларусі, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны.

*стаялі ў ачапленні, пачалі страляць у людзей, што знаходзіліся ў гумне, стралялі і з двух станковых кулямётаў…*

*Я асабіста не страляў, хоць у мяне і была вінтоўка СВТ, я не мог страляць у бяззбройных, непавінных людзей...»*

Наколькі шчырымі былі раскаянні катаў Хатыні, калі настаў час расплаты, даводзіцца толькі гадаць. А вось тое, што некаторыя з іх на працягу не аднаго дзесяцігоддзя пасля сваіх зверстваў у час вайны пазбягалі пакарання, – факт. Сярод тых, каму ўдалося доўгі час хавацца і выдаваць сябе за прыстойнага грамадзяніна, быў і былы начальнік штаба 118-га паліцэйскага батальёна Рыгор Васюра. Ён утойваў сваё мінулае ажно да сярэдзіны 1980-х гадоў. Пасля вайны гэты карнік вярнуўся на радзіму – у Чаркаскую вобласць Украіны і працаваў аграномам. У 1952 годзе яго арыштавалі як памагатага фашысцкага рэжыму (у час следства Васюра свайго пасобніцтва ворагу не хаваў, але ні словам не абмовіўся пра Хатынь) і засудзілі на 25 гадоў. Аднак у канцы 1955 года згодна з рашэннем Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР аб амністыі савецкіх грамадзян, якія супрацоўнічалі з акупантамі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны, ён выйшаў на волю. Пасля гэтага ён прыехаў у сяло Вялікая Дымерка Браварскага раёна Кіеўскай вобласці, дзе з часам абжыўся і набыў грамадскую вагу – працаваў намеснікам дырэктара мясцовага саўгаса, уваходзіў у актыў раённай ветэранскай арганізацыі, рэгулярна сустракаўся са школьнікамі і навучэнцамі, якім расказваў пра свае выдуманыя франтавыя подзвігі. Васюру нават залічылі ганаровым курсантам Кіеўскага вышэйшага ваеннага інжынернага вучылішча сувязі, якое ён скончыў перад вайной… Аднак усё ж настаў час расплаты і яму давялося расказаць трыбуналу Беларускай ваеннай акругі ўсю праўду пра сваё мінулае і панесці заслужанае пакаранне: паводле прыгавора ў адносінах да яго была выкарыстана вышэйшая мера – расстрэл.

Як сведчаць дакументы, на пасяджэнні трыбунала Р. Васюра даў яскравыя і надзвычай поўныя характарыстыкі многім сваім саўдзельнікам: «Гэта была шайка бандытаў, для якіх галоўнае – рабаваць і п’янстваваць. Вазьміце камузвода Мялешку – кадравы савецкі афіцэр і форменны садыст, літаральна шалеў ад паху крыві. Кухар Мышак рваўся на ўсе аперацыі, каб пазверстваваць і парабаваць. Нічым не грэбавалі камандзір аддзялення Лакуста і пісар Філіпаў. Перакладчык Луковіч катаваў людзей на допытах, гвалтаваў жанчын. Усе яны былі мярзотнікі з мярзотнікаў. Я іх ненавіджу…»

…Здавалася, што ў справе асуджэння карнікаў, якія мелі дачыненне да хатынскай трагедыі, пастаўлена ўжо кропка. Але летась сусветныя сродкі масавай інфармацыі абляцела сенсацыйная вестка: у Канадзе ўдалося адшукаць Уладзіміра Катрука, былога паліцэйскага 118-га асобнага батальёна, аднаго з тых, хто паліў Хатынь. Яго прозвішча неаднаразова ўзгадваецца ў архіўных матэрыялах зборніка «Хатынь. Трагедия и память». З 1951 года ён жыў і паспяхова разводзіў пчол дзесьці пад Квебекам. Які сёння лёс карніка, якому больш за 90 гадоў, – невядома. Прынамсі, пра гэта маўчыць Інтэрнэт-усёзнайка.

## Каб помнілі

Хатынь цяпер ведаюць далёка за межамі нашай краіны. Трагедыя гэтай беларускай вёскі атаясамліваецца з лёсам тысяч паселішчаў, знішчаных фашыстамі ў гады Другой сусветнай вайны. Хатынь сярод іх стала міжнародным сімвалам жалобы і смутку па бязвінна загінуўшых у полымі ваенных пажараў людзях. Менавіта таму Дзяржаўны мемарыяльны комплекс «Хатынь» і з’яўляецца асабліва памятным месцам.

Рашэнне аб яго будаўніцтве было прынята ў 1966 годзе Цэнтральным Камітэтам Кампартыі Беларусі. Ідэя праз трагедыю Хатыні паказаць трагедыю ўсёй Беларусі належала Кірылу Мазураву, які да 1965 года быў першым сакратаром ЦК КПБ, а потым пайшоў на павышэнне ў Маскву. Ініцыятыва была падхоплена пераемнікам Мазурава на пасадзе кіраўніка рэспублікі Пятром Машэравым. Пётр Міронавіч, сам былы партызанскі камандзір, маці якога расстралялі фашысты, уклаў у стварэнне мемарыяла ў Хатыні частку сваёй душы.

У агульным конкурсе на лепшы праект помніка жыхарам спаленай вёскі перамог калектыў архітэктараў, сярод якіх былі Юрый Градаў, Валянцін Занковіч, Леанід Левін і скульптар народны мастак Беларусі Сяргей Селіханаў. Першапачаткова меркавалася, што на месцы трагедыі паўстане толькі мемарыял у гонар спаленай Хатыні. Аднак затым праект быў перагле-

джаны, і з'явіўся помнік усім спаленым у гады Вялікай Айчыннай вайны вёскам Беларусі.

Тэматычна Хатынскі мемарыял складаецца з некалькіх частак, але мае адзінае кампазіцыйнае вырашэнне, якое грунтуецца на планіровачнай структуры былой вёскі Хатынь. У цэнтры комплексу бронзавая скульптура «Няскораны чалавек» (яе вышыня звыш 6 метраў) з забітым хлопчыкам на руках. Побач – самкнёныя гранітныя пліты, якія нагадваюць дах гумна, у якім карнікі спалілі хатынцаў. На брацкай магіле мармуровы «Вянок памяці» з тэкстамі сімвалічных зваротаў загінуўшых да жывых з просьбай берагчы мір і спакой на зямлі.

Былая вуліца вёскі выкладзена шэрымі, пад колер попелу, жалезабетоннымі плітамі. У тых месцах, дзе калісьці стаялі хаты, пастаўлена 26 сімвалічных бетонных ніжніх вянкоў зрубаў і столькі ж абеліскаў, якія нагадваюць пячныя трубы, абпаленыя агнём. Перад кожным са спаленых дамоў устаноўлена адкрытая брамка як сімвал гасціннасці жыхароў вёскі. На трубах-абеліскaх – бронзавыя шыльды з імёнамі тых, хто тут нарадзіўся і жыў, а пазней загінуў у вогненным пекле. Над кожным абеліскам – сумна вядомы хатынскі звон.

На тэрыторыі Хатынскага комплексу знаходзяцца адзіныя ў свеце «Могілкі вёсак» – 185 сімвалічных магіл, кожная з якіх нагадвае пра адну са спаленых разам з жыхарамі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, але так і не адроджаных беларускіх вёсак. 186-я вёска – гэта сама Хатынь. Кожная сімвалічная магіла спаленай вёскі ўяўляе сабой папялішча, у цэнтры якога размешчаны п'едэстал у выглядзе языка полымя – сімвал таго, што паселішча было спалена. Тут жа ў жалобнай урне захоўваецца зямля, прывезеная з месца, дзе размяшчалася знішчаная карнікамі вёска.

Яшчэ адзін мемарыяльны элемент Хатынскага комплексу – «Дрэва жыцця», на галінах якога ў алфавітным парадку пералічаны назвы беларускіх вёсак, якія былі знішчаны акупантамі разам з жыхарамі, але адноўлены пасля вайны. На мемарыяльнай «Сцяне памяці» ўстаноўлены пліты з назвамі 260 лагераў смерці і месцаў масавага знішчэння людзей фашыстамі на тэрыторыі Беларусі.

Кожны з элементаў Хатынскага мемарыяла мае сваю сімволіку, у якой заключаны глыбокі сэнс і арыгінальнае вырашэнне тэмы перажытага жыхарамі нашай краіны ў гады Вялікай Айчыннай вайны трагізму і адначасова няскоранасці і мужнасці беларускага народа.



▲ Жалобна-памятныя мерапрыемствы ў Хатыні

На мемарыяле існуе і фотадакументальная экспазіцыя, матэрыялы і дакументы якой расказваюць пра бязвінных ахвяр Другой сусветнай вайны, развязанай германскім фашызмам у імя ажыццяўлення паранаідальнай ідэі панавання над светам. Тэматычна яна складаецца з чатырох экспазіцыйных залаў, адна з якіх прысвечана гісторыі стварэння і дзейнасці мемарыяльнага комплексу «Хатынь». Варта адзначыць і тое, што ў Дзяржаўнага мемарыяльнага комплексу «Хатынь» ёсць два філіялы. Гэта ўсім вядомы велічны Курган Славы на Смалявіччыне і мемарыяльны комплекс «Дальва» ў тым жа Лагойскім раёне, які ўшаноўвае памяць пра апошнюю беларускую вёску, спаленую гітлераўцамі за некалькі дзён да вызвалення Беларусі.

…У Хатынь сёння едуць людзі з розных краін, каб ушанаваць памяць усіх загінуўшых у полымі ваеннага ліхалецця беларусаў. Калі надарыцца магчымасць, наведайце скрушны Хатынскі мемарыял і вы. І абавязкова прыслухайцеся да жалобнага перазвону. Ён гучыць як памяць пра спаленыя беларускія вёскі, як папярэджанне, каб падобныя трагедыі больш ніколі не паўтарыліся на нашай зямлі.

**Сяргей ГАЛОЎКА**